**КАДРЫ БДУ ДЛЯ АІПІ**
30 % супрацоўнікаў лабараторыі распазнавання і сінтэзу маўлення з'яўляюцца выпускнікамі БДУ
Стар. 2

**10 ДЗЕСЯЦІГОДДЗЯЎ БДУ**
У працяг вялікага гістарычнага нарыса пра дзейнасць БДУ разглядаем супярэчлівы перыяд 1930-х гадоў
Стар. 4–5

**«НА ЎВЕСЬ КУРС БЫЎ АДЗІН ПАДРУЧНІК ФІЛАСОФІІ»**
Успаміны выпускніка гістарычнага факультэта 1951 года Расціслава ЦІМАФЕЕНКІ
Стар. 6

**ІНТЭЛЕКТУАЛЫ ВІРУЮЦЬ**
Нядаўна прайшоў першы адборачны тур у чэмпіянаце «БДУ–100», прысвечаны юбілею ўніверсітэта
Стар. 7

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

23 сакавіка 2021года, № 5 (2242)

# Прадметныя рэйтынгі

## Якія перспектывы ў БДУ?




БДУ падняўся на 100 месцаў і застаўся адзіным прадстаўніком Беларусі ў абноўленым прадметным рэйтынгу «Фізіка і астраномія» міжнароднага агенцтва Quacquarelli Symonds (QS).

У дадзеным рэйтынгу БДУ апынуўся ў групе 451–500 сярод амаль 30 000 існуючых ВНУ. Рост абумоўлены паляпшэннем рэпутацыі сярод экспертаў, павелічэннем колькасці артыкулаў па прадметнай галіне і колькасці іх цытаванняў. Прадметныя рэйтынгі распрацаваны для дапамогі студэнтам у выбары ўніверсітэтаў па цікавых для іх напрамках. У залежнасці ад спецыфікі катэгорыі колькасць ранжыраваных універсітэтаў вар'іруецца ад 50 да 600 найлепшых ВНУ.

Гісторыя міжнародных рэйтынгаў адукацыйных устаноў налічвае больш за 160 гадоў: першую спробу параўнання 13 тэхнічных еўрапейскіх інстытутаў напісаў на 200 старонках у 1863 годзе К. Коржыстка (Der hoehere polytechnische Unterricht in Deutschland, der Schweiz, in Frankreich, Belgien und England). У сучасным выглядзе рэйтынгі ўніверсітэтаў як спісы, якія публікуюцца штогод, з'явіліся ў шэрагу краін не так даўно, у 1970–1980 гадах. Першы ж глабальны рэйтынг выйшаў у Шанхаі ў 2002 годзе і стаў настолькі папулярным, што ўвесь свет ахапіла «рэйтынгавая ліхаманка». Пасля Шанхайскага былі распрацаваны і запушчаны каля 20 розных глабальных рэйтынгаў. Большасць з рэйтынгаў аналізуе звесткі пра ВНУ ўручную, таму абмяжоўвае колькасць удзельнікаў. Першыя выпускі ўтрымлівалі ўсяго 500 універсітэтаў, цяпер пералікі пашырыліся да 1000–1500 і нават да 3000 удзельнікаў, і толькі вэбаметрычныя рэйтынгі паказваюць усе 30 000 універсітэтаў свету.

У апошнія гады ўсё больш увагі надаецца прадметным рэйтынгам, паколькі ў першую тысячу патрапіць можа толькі буйны класічны ўніверсітэт, а невялікай профільнай ВНУ канкурыраваць з ім вельмі складана. Прадметныя ж рэйтынгі дазваляюць параўнаць усе ўніверсітэты падобнага профілю, напрыклад, архітэктурныя, інжынерныя, нават музычныя акадэміі. БДУ сёння прысутнічае ў 7 глабальных прадметных рэйтынгах: 5 па фізіцы і фізічных навуках (Шанхайскі 201–300, брытанскія THE 801+ і QS 451–500, амерыканскі U.S.News 176, турэцкі URAP 778), а таксама ў THE па «інжынерных навуках і тэхналогіях» 601–800 і па хіміі ў U.S.News 612. Ва ўсіх пералічаных рэйтынгах БДУ з'яўляецца адзіным універсітэтам з Беларусі.

3 сакавіка 2021 года абнавілася сямейства 51 прадметнага рэйтынгу QS, таму спынімся на іх больш падрабязна. Усе яны разлічваюцца з дапамогай 4 індыкатараў:

**1.** акадэмічная рэпутацыя, па апытаннях 10 000 экспертаў з усяго свету;

**2.** рэпутацыя сярод працадаўцаў, па апытаннях 100 000 экспертаў з усяго свету;

**3.** сярэдняе цытаванне на 1 артыкул, артыкулы ўзяты з індэкса Scopus па прадмеце за 5 гадоў (2014–2018), спасылкі – за 6 гадоў (2014–2019);

**4.** індэкс Хірша абранага масіву публікацый.

Па кожным прадмеце гэтыя 4 індыкатары маюць сваю вагу, для «Фізікі» гэта 40 %, 20 %, 20 % і 20%, адпаведна. Для некаторых гуманітарных прадметаў, такіх як «Мастацтва і дызайн», публікацыі не ўлічваюцца, і вага 3 і 4 індыкатара роўная нулю. БДУ змог падняцца ў прадметным рэйтынгу па фізіцы на 100 пазіцый за кошт паляпшэння рэпутацыі і індэкса Хірша:

| | | Індыкатары, ацэнка па 100-бальнай шкале | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Год** | **Месца ў прадметным рэйтынгу QS па фізіцы** | **1** | **2** | **3** | **4** |
| **2021** | 451–500 | 47,2 | 60,8 | 58,3 | 62,0 |
| **2020** | 551–600 | 46,4 | 56,6 | 59,7 | 51,1 |

Дадаткова варта адзначыць, што БДУ выканаў неабходныя ўмовы для ўдзелу ў 18 іншых прадметных рэйтынгах сямейства QS, але не ўвайшоў у публікуемы пералік. Сярод самых перспектыўных прадметаў, па якіх мы можам патрапіць у публікуемыя спісы, адзначым наступныя: Chemical Engineering (хімічная прамысловасць), Electrical & Electronic Engineering (электрыка і электроніка), Mechanical, Aeronautical & Manufacturing Engineering (інжынірынг: машынабудаванне, авіяцыя і вытворчасць), Natural Sciences (прыродазнаўчыя навукі), Chemistry (хімія) і Mathematics (матэматыка). Каб патрапіць у публікуемы пералік гэтых прадметных рэйтынгаў, трэба павялічыць колькасць цытаванняў публікацый.

Таксама БДУ ўдзельнічае ў 11 глабальных рэйтынгах універсітэтаў свету, у тым ліку ў QS, займаючы 317 месца, а ў U.S. News – 367.

**Уладзімір ГАЛЫНСКІ**

**ДА 100-ГОДДЗЯ БДУ**

***У лютым прайшлі першыя мерапрыемствы з плана падрыхтоўкі 100-годдзя БДУ.***

Так, быў праведзены спартыўна-аздараўленчы фэст «Вакацыі ў Лагойску»; дадзены старт чэмпіянату па інтэлектуальных гульнях «БДУ – 100!»; распачаты рубрыкі і флэшмобы ў сацыяльных сетках «100 асобаў БДУ», «Улюбёная фатаграфія ў студэнцкія гады» і іншыя.

Абноўлены раздзел на галоўным сайце «Да 100-годдзя БДУ», у якім удакладнены даты правядзення мерапрыемстваў, размешчана інфармацыя пра першых партнёраў па святкаванні 100-гадовага юбілею ўніверсітэта.

Працягваецца праца па прыцягненні вядучых прадпрыемстваў і фірмаў і міжнародных партнёраў. Так, абмеркаваны пытанні супрацоўніцтва з Нацыянальным банкам Беларусі, РУП «Белпошта», СААТ «Камунарка», аздараўленчым комплексам «Фрыстайл» і іншымі.

У сакавіку мяркуецца правядзенне экалагічных і спартыўных мерапрыемстваў.

18 сакавіка адбылася прэзентацыя брэндбука 100-годдзя БДУ і дадзены старт набору ў студэнцкі добраахвотніцкі арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы і святкаванні 100-годдзя БДУ.

***

***Рубрыку «БДУ ва ўсіх кутках Беларусі» запусцілі ў рэгіянальных СМІ краіны.***

На працягу юбілейнага года ў рэгіянальных СМІ Беларусі выйдуць інтэрв'ю з прадстаўнікамі рэктарата, дэканамі, выбітнымі навукоўцамі і даследчыкамі. Акрамя таго, журналісты падрыхтуюць цыкл матэрыялаў пра студэнтаў, якія дасягнулі поспехаў у навуковай, спартыўнай і культурнай сферах жыцця.

Чытачы даведаюцца пра сувязь таленавітых дзеячаў універсітэта з малой радзімай, уклад у развіццё БДУ і айчыннай адукацыі.

Стартавала рубрыка з інтэрв'ю дэкана гістарычнага факультэта *Аляксандра Каха욳ўскага* ў «Маладзечанскай газеце». Ён распавёў пра свае школьныя гады, сямейную дынастыю гісторыкаў, перавагі сучаснага гістарычнага факультэта.

Наступным героем рубрыкі ў газеце «Гомельская праўда» стане прарэктар па навуковай рабоце *Васіль Сафонаў*.

Штомесяц будзе публікавацца да дзесяці матэрыялаў у рэгіянальных СМІ ўсіх абласцей краіны.

З інтэрв'ю можна азнаёміцца на ўніверсітэцкім сайце ў рубрыцы «Да 100-годдзя БДУ».

УНІВЕРСІТЭТ
23 сакавіка 2021 года, № 5 (2242)

# Кадры БДУ для АІПІ

## У трэндзе электронныя гуманітарыі

У топе месцаў для размеркавання сярод выпускнікоў БДУ – Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі НАН – адна з найлепшых устаноў для тых, хто абраў сваім лёсам навуку і хоча бачыць практычнае прымяненне ўласных распрацовак.




Фота Надзеі МАРХЕЛЬ

*Загадчык лабараторыі распазнавання і сінтэзу маўлення АІПІ Юрась Гецэвіч*

### Беларуская мова – актуальна і запатрабавана

**Лабараторыя распазнавання і сінтэзу маўлення** – адна з 21, адметная сваёй працай з рознымі мовамі. Яна займаецца аўтаматызацыяй бізнес-працэсаў з выкарыстаннем штучнага інтэлекту і аўтаматызаванай апрацоўкай тэксту і маўлення. За амаль 60-гадовую гісторыю мае мноства ўласных распрацовак і міжнародных кантактаў. Сёння прыярытэтны кірунак працы – пашырэнне прысутнасці сістэм апрацовак беларускай мовы як у навуковай прасторы, так і для паўсядзённага ўжытку.

Напрыклад, вядомая мабільная праграмма з аўдыягідам KrokApp дапамагае даведацца пра будынкі, вуліцы і культурныя аб'екты Беларусі. Сэрвіс Corpus.by змяшчае для тэсціравання розныя часткі сістэм распазнавання і сінтэзу маўлення, а таксама сістэм камунікацыі. **Загадчык лабараторыі Юрась ГЕЦЭВІЧ** (выпускнік ФПМІ БДУ 2007 г.) падкрэслівае:

– Любы чалавек, выкарыстоўваючы сэрвісы для сваіх патрэб, можа даслаць нам заўвагі і прапановы, і разам з намі зрабіць іх больш дасканалымі. Нашы кліенты – грамадзяне, навукоўцы, інжынеры і нават цэлыя кампаніі, якіх цікавяць разнастайныя задачы ў галіне апрацоўкі тэкставай ці гукавой інфармацыі. Таму зараз мы шмат з кім супрацоўнічаем. Напрыклад, наша сістэма сінтэзу маўлення зараз убудоўваецца ў інтэрнэт-сайты, парталы – у тым ліку для таго, каб агучваць версіі тым, хто мае праблемы са зрокам. Так мы папулярызуем беларускую мову.

### Рабіць тое, што важна зараз і што падабаецца

Па словах Юрася Станіслававіча, у лабараторыі ад 10 да 20 праектаў у рознай фазе. Яны не проста займаюцца аўтсорсам, а бяруць складаныя задачы, звязаныя з мовай, культурай, гісторыяй. Часта ў іх можа не быць замоўцы, яны распрацоўваюцца таму, што задача новая, актуальная і падабаецца калектыву. Дарэчы, у штаце зараз працуе 15 спецыялістаў, 30 % з якіх – выпускнікі БДУ.

Пытанне развіцця электронных рэсурсаў для беларускай мовы – задача № 1 для навуковага свету, і яе вырашаюць у лабараторыі.

– Сумесна з Інстытутам мовазнаўства імя Якуба Коласа мы зрабілі «Арфаэпічны слоўнік беларускай мовы». Лінгвісты пераправерылі абноўленую версію сістэмы і выслалі заўвагі. У выніку мы дамагліся таго, што сістэма генерацыі фанетыкі пачатковых форм слоў беларускай мовы працуе правільна на 98 %, гэта высокі паказчык.

### Супрацоўніцтва з БДУ

Лабараторыя плённа супрацоўнічае з факультэтам сацыякультурных камунікацый, філалагічным факультэтам і ФПМІ. З першым падпісана дамова аб стварэнні філіяла кафедры на базе лабараторыі.

– Мы абменьваемся досведам, публікацыямі, вучэбнымі курсамі, – кажа Юрась Гецэвіч. – У нас ёсць агульныя студэнты і нават у пэўным сэнсе агульныя супрацоўнікі. Са студэнтамі з беларускай, рускай, славянскай, рамана-германскай філалогіі пішам курсавыя і дыпломныя, потым бяром на працу. На ФПМІ курс «Распазнаванне і сінтэз маўлення» праходзіць зусім па-іншаму, чым для лінгвістаў. Праграмісты больш падкаваныя з тэхнічнага боку, яны звяртаюць увагу на некаторыя дэталі, якіх лінгвісты не заўважаюць, – асабліва гэта тычыцца пытанняў бяспекі працы сэрвісаў, парталаў. Дзякуючы ім, мы пастаянна паляпшаем платформу Corpus.by.

Лабараторыя з'яўляецца лагічным працягам курсаў, якія мы чытаем на факультэтах. Напрыклад, «Аналіз і сінтэз маўлення», «Праблемы штучнага інтэлекту», «Камп'ютарныя тэхналогіі ў лінгвістыцы». Студэнты звычайна хочуць працягваць. Калі ім спадабаўся нейкі праект, мы запрашаем на практыку ці напісаць курсавыя і дыпломныя праекты. Мы заўсёды шукаем месцы на размеркаванне для перспектыўных людзей.

### А як жа навука?

Лабараторыя зараз уваходзіць у міжнародную асацыяцыю NooJ, у міжнародны цэнтр ведаў CLARIN па апрацоўцы беларускіх тэкстаў і маўлення, еўрапейскую тэхнічную супольнасць Europeana.

Зацікаўленыя маладыя навукоўцы распрацоўваюць у лабараторыі свае тэмы па дыпломных, магістарскіх, кандыдацкіх працах. Штатныя супрацоўнікі рыхтуюць публікацыі па спецыяльнай сістэме, якая дазваляе атрымаць ад 10 да 30 артыкулаў у год.

– Мы больш з IT, чым з гуманітарнага боку, таму дапускаецца, калі ў артыкуле некалькі суаўтараў. Складана, а часам нават немагчыма, каб адзін чалавек зрабіў усё. Напрыклад, мы распрацоўваем нейкі сэрвіс, далей пішам для яго «хэлп» – вельмі разгорнутую даведку, пра тое, як ён працуе, яго практычную каштоўнасць. Ён становіцца падмуркам для будучага навуковага артыкула. Стараемся знаёміць з усімі партнёрамі моладзь, яны набываюць аўтарытэт, удзельнічаюць у канферэнцыях. Кожны месяц лабараторыя збіраецца на навуковы семінар. Тут абмяркоўваюцца зробленыя праекты, планы на наступны месяц. Калектыў розны: тут ёсць кандыдаты тэхнічных, філалагічных і гістарычных навук, ёсць людзі без ступеняў і на перакрыжаванні навук.

### Калектыў маладых геніяў

Лабараторыя – гэта найперш людзі, якія робяць свой унёсак у супольную працу. Іх вельмі скрупулёзная праца у выніку паказвае, якія алгарытмы можна сабраць у нейкі сэрвіс, каб по-тым даць яго ў карыстанне ўсім ахвочым.

У маладых ёсць выдатная магчымасць павучыцца ў легенды беларускай навукі і старэйшага супрацоўніка Барыса Лабанава. Уся каманда дружная, а загадчык лічыць, што працуе з геніямі.

### Лінгвіст як кава 3 у 1?

Супрацоўнікі могуць змяняць профіль з праграмістаў у лінгвісты і наадварот. Па жаданні ім падбяруць новы праект. Можна перайсці і ў іншую лабараторыю АІПІ, тут іх каля 30, напрыклад, займацца біямедыцынскімі выявамі, картаграфіяй ці касмічнай тэматыкай.

– Лінгвісты зараз вельмі запатрабаваныя, бо яны людзі з камунікацыйнай сферы. Часта ўзнікае задача: зрабіць мы можам што заўгодна, але для каго? На гэта адказваюць якраз яны, у лабараторыі нават ёсць спецыяльная методыка, як знаходзіць патэнцыйных партнёраў, кантакты. Праз удалыя перагаворы гуманітарыяў і тэхнічных спецыялістаў можна значна пашырыць бюджэт праекта ў замоўцы.

Нават слова «лінгвіст» зараз мяняецца на digital humanities, г. зн. «электронны гуманітарый». Ён не баіцца ўключыць дыктафон, падрэдагаваць свае файлы, зрабіць транскрыбацыю. Ён здольны перакласці тэкст ці нават напісаць прапанову праекта патэнцыйнаму замоўцу. Патрэба ў такіх спецыялістах ёсць заўсёды. А ад праекта залежыць аплата, тое, што зарабілі, і размяркоўваем паміж удзельнікамі.

### Каго чакае лабараторыя?

– БДУ дае студэнтам добрыя веды, якія можна накіраваць, куды патрэбна. Не ставім планку па hard і soft skills, калі калектыў пагаджаецца, мы бяром чалавека на працу, а далей прапаноўваем кірункі для навучання і развіцця ў канкрэтных сферах і праектах, – адказвае Юрась Гецэвіч.

Мы за тое, каб камп'ютарная лінгвістыка ўваходзіла ў шматлікія сферы народнай гаспадаркі – у медыцыну, у юрыспрудэнцыю, у гісторыка-культурны дамен, у турызм і г. д. Таму спрыяем, каб да нас размяркоўваліся розныя спецыялісты: гісторыкі, прадстаўнікі social sciences, іншыя гуманітарыі – перакладчыкі, юрысты. Але, канешне, праграмістам і лінгвістам у нас дарога адкрытая. І заўсёды стараемся ствараць асяроддзі, дзе ёсць навукоўцы з розных сфер.

На Corpus.by ёсць 70 сэрвісаў, дзе можна праявіць сябе. Таксама там мы бясплатна выставілі курс, дзе кожны можа праверыць свае навыкі.

### Водгукі маладых спецыялістаў

**Сяргей МАЕЎСКІ, малодшы навуковы супрацоўнік, выпускнік філалагічнага факультэта 2014 г.:**



– Яшчэ на трэцім курсе філалагічнага факультэта захапіўся праграмаваннем. Свой першы сайт нават прысвяціў каханай дзяўчыне. У 2019 г. скончыў аспірантуру па спецыяльнасці «прыкладная матэматычная лінгвістыка» на родным факультэце і праграму перападрыхтоўкі Інстытута бізнесу БДУ «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных сістэм». Адначасова я філолаг і інжынер-праграміст. З Юрасём Гецэвічам я быў знаёмы яшчэ з 2010 г., калі ён выкладаў на кафедры прыкладной лінгвістыкі. Спачатку я займаўся перакладамі і вычыткай беларускіх версій сайтаў медыцынскіх устаноў, гідаў і аўдыягідаў, дапаможнікаў карыстальнікаў. Цяпер займаюся вылучэннем імянных дзеяслоўных груп у тэкстах на рускай і англійскай мовах. Я займаюся апрацоўкай натуральнай мовы з дапамогай сродкаў праграмавання Python.

Падабаецца атмасфера ў лабараторыі, яна добрая менавіта для маладых людзей, калі свядомасць яшчэ не сапсавана меркантыльнымі амбіцыямі. У любой справе грошы пабочны прадукт, бо галоўнае, каб твая праца была патрэбная і мела прымяненне! Таксама тут можна запатэнтаваць сваю распрацоўку, што я і хачу зрабіць.

**Яўгенія ЗЯНОЎКА, малодшы навуковы супрацоўнік, выпускніца факультэта сацыякультурных камунікацый 2015 г.:**



– Скончыла ФСК па спецыяльнасці «сучасныя замежныя мовы: камп'ютарны лінгвіст, выкладчык дзвюх замежных моў (англійскай і іспанскай)». Затым уладкавалася ў лабараторыю распазнання і сінтэзу маўлення АІПІ НАН Беларусі і паступіла ў магістратуру філалагічнага факультэта БДУ па спецыяльнасці «прыкладная і матэматычная лінгвістыка». У 2019 г. скончыла аспірантуру Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры па спецыяльнасці «сучасная беларуская мова».

Юрась Гецэвіч выкладаў нам прадмет «Камп'ютарныя тэхналогіі ў лінгвістыцы» і прапанаваў супрацоўніцтва. Цяпер сама выкладаю на факультэце сацыякультурных камунікацый БДУ па тым профілі.

Мяне прыцягвае малады і дружны калектыў, праца па спецыяльнасці. Мой асноўны інтарэс – распрацоўка фармальных правілаў і алгарытмаў рашэння дэлімітацыі сінтэзаванага маўлення. Таксама займаюся пошукам і распрацоўкай (падачай) новых праектаў, пішу артыкулы для ўдзелу ў розных канферэнцыях і навуковых часопісах, перакладаю публіцыстычныя артыкулы на англійскую і беларускую мовы. Праца ў лабараторыі лічыцца добрым досведам для развіцця прагматычных навыкаў у камп'ютарнай лінгвістыцы. Неўзабаве планую абараніць дысертацыю на тэму «Аптымізацыя лінгваакустычных рэсурсаў для сістэм сінтэзу беларускага маўлення».

Для кожнага супрацоўніка падбіраюцца простыя задачы, якія паступова ўскладняюцца. Нават калі не засвоілі нейкія тэарэтычныя аспекты ва ўніверсітэце, у лабараторыі абавязкова навучаць усяму і дадуць паспрабаваць сябе ў розных напрамках.

**Надзея МАРХЕЛЬ**

# Новы дэкан для факультэта міжнародных адносін

Дэканам факультэта міжнародных адносін БДУ прызначана Алена ДАСТАНКА, якая была прадстаўлена калектыву 4 сакавіка на савеце факультэта.



Алена Дастанка працавала на ФМА з 1998 да 2018 года на пасадах выкладчыка, старшага выкладчыка, дацэнта, намесніка дэкана і начальніка цэнтра міжнародных даследаванняў БДУ.

Рэктар БДУ Андрэй Кароль выказаў упэўненасць у далейшым эфектыўным развіцці ФМА пад кіраўніцтвам Алены Дастанка, што дазволіць выпрацаваць стратэгію працы факультэта і выканаць яго місію з улікам зменлівага свету. Ён назваў дэкана ФМА 2008–2021 года *Віктара Шадурскага* заслужаным прафесіяналам і паважаным чалавекам сярод усяго калектыву БДУ.

Па словах Алены Дастанка, яна разлічвае на аб'яднанне намаганняў прафесарска-выкладчыцкага складу ФМА для рэалізацыі важных мэт.

***

Дастанка Алена Анатольеўна нарадзілася 23 верасня 1973 г. у Мінску. Кандыдат палітычных навук, дацэнт.

У 1995 г. скончыла БДУ, а ў 1998 г. – аспірантуру ВНУ. З 1995 па 1996 год – начальнік аддзела сацыялагічных даследаванняў «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» (г. Мінск).

З 1998 г. працуе на факультэце міжнародных адносін БДУ. Займала пасады выкладчыка, старшага выкладчыка, дацэнта кафедры міжнародных адносін, намесніка дэкана і начальніка цэнтра міжнародных даследаванняў. З 2018 г. працавала начальнікам Галоўнага ўпраўлення адукацыйнай дзейнасці БДУ.

У сферу навуковых інтарэсаў уваходзяць палітычныя праблемы еўразійскай і еўрапейскай інтэграцыі, міжнароднага шматбаковага супрацоўніцтва. З'яўляецца навуковым рэдактарам зборніка навуковых артыкулаў «Актуальныя праблемы міжнародных адносін і глабальнага развіцця».

Лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў (2005 г.), а таксама прэміі НАН Беларусі імя акадэміка В. Ф. Купрэвіча маладым навукоўцам (2007 г.). Абвешчана падзяка рэктара БДУ (2007, 2019 гг.), ушанавана ганаровымі граматамі БДУ (2010, 2015 гг.), Акадэміі навук Рэспублікі Таджыкістан (2014 г.) і Міністэрства замежных спраў Беларусі (2015 г.).

Аўтар звыш 40 публікацый па інтэграцыйнай праблематыцы, шматбаковым міжнародным супрацоўніцтве Рэспублікі Беларусь, дзейнасці Беларусі ў міжнародных арганізацыях, у тым ліку трох манаграфій па працэсах паглыблення і пашырэння еўрапейскай інтэграцыі, адной з іх – у суаўтарстве.

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

ВІНШУЕМ!

# Дзяржаўны чалавек

Валерый ЦІХІНЯ зрабіў значны ўнёсак у развіццё юрыдычнага факультэта, юрыдычнай адукацыі і навукі, фарміраванне шэрагу інстытутаў беларускай дзяржавы.



Увосень 2020 года Валерый Гур'евіч адсвяткаваў асабістае 80-годдзе і адначасова прыняў удзел у падрыхтоўцы юбілейнага зборніка па развіцці навукі на юрыдычным факультэце.

Пасля заканчэння БДУ ў 1963 г. атрымаў накіраванне на працу экспертам-крыміналістам у Мінскі навукова-даследчы інстытут судовых экспертыз, дзе працаваў над кандыдацкай дысертацыяй. У сакавіку 1966 г. В. Г. Ціхіня перайшоў на працу ў органы пракуратуры, быў памочнікам пракурора горада Мінска, а затым пракурорам Ленінскага раёна Мінска.

Абараніўшы кандыдацкую дысертацыю ў 1974 г., Валерый Гур'евіч да 1989 г. плённа займаўся выкладчыцкай працай. Ён сканцэнтраваў сваю навуковую і педагагічную цікавасць на праблемах грамадзянскага працэсу, хоць пасля з-пад яго пяра выйшлі матэрыялы па канстытуцыйным, сямейным, грамадзянскім праве, крыміналістыцы, міжнародным публічным і міжнародным прыватным праве (усяго звыш 500).

Дзякуючы сваёй выключнай працавітасці і заслужанаму аўтарытэту, у красавіку 1982 года В. Г. Ціхіня быў абраны дэканам юрыдычнага факультэта і заставаўся на гэтай пасадзе да 1986 года. За вялікі ўнёсак у падрыхтоўку юрыдычных кадраў быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Велізарны досвед арганізацыйна-кіраўнічай працы вывеў яго на ўніверсітэцкі ўзровень, дзе з 1986 па 1989 г. з'яўляўся першым прарэктарам БДУ, а затым яго арганізатарскія здольнасці былі запатрабаваны беларускай дзяржавай.

Валерый Гур'евіч набыў павагу юрыстаў, займаючы адказныя пасады: міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь, намесніка старшыні Вышэйшай атэстацыйнай камісіі, дэпутата Вярхоўнага Савета, а таксама быў абраны членам-карэспандэнтам НАН Беларусі. Праз свой аўтарытэт ён быў абраны першым старшынёй Канстытуцыйнага суда.

Нельга не адзначыць фундаментальны ўнёсак В. Г. Ціхіні ў развіццё навукі грамадзянскага працэсуальнага права на аснове доктарскай дысертацыі «Тэарэтычныя праблемы прымянення даных крыміналістыкі ў грамадзянскім судаводстве» (1984 г.) і падрыхтоўку шэрагу кандыдатаў юрыдычных навук: Калядку І. М., Камянкова В. С., Казей І. М., Галаванава В. Р., якія праявілі сябе як выкладчыкі юрыдычнага факультэта або як вядучыя кіраўнікі дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь. Увагу да падрыхтоўкі навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі В. Г. Ціхіня не аслабляў у перыяд працы ў дзяржаўных органах. Пад яго навуковым кіраўніцтвам абаронена 31 кандыдацкая дысертацыя і падрыхтаваны 2 дактары юрыдычных навук.

Валерый Гур'евіч захаваў сувязь з юрыдычным факультэтам БДУ і, знаходзячыся ў яго сценах, з падзякай успамінае тое, што яму дала alma mater, сваю працу на карысць факультэта. Ён задаволены прагрэсам у развіцці юрыдычнай адукацыі і навукі, які забяспечылі яго паслядоўнікі – як кіраўніцтва, так і прафесарска-выкладчыцкі склад.

**Ад імя калегаў**
**дацэнт Іван КАЛЯДКА**

✓ 24 сакавіка ў межах асветніцкага праекта ***«Спадчына права»*** адбудзецца прэзентацыя выдання ***«В. Г. Ціхіня. Выбраныя працы»***. У збор увайшлі манаграфіі і навуковыя артыкулы беларускага навукоўца-правазнаўца. Працы аўтара прысвечаны канстытуцыйным каштоўнасцям Рэспублікі Беларусь, актуальным праблемам грамадзянскай судовай практыкі, крыміналістыкі, міжнароднага публічнага і прыватнага права, а таксама працэсам фарміравання прававой дзяржавы ў сучасным грамадстве. Мерапрыемства адбудзецца з удзелам сяброў навуковага савета праекта «Спадчына права», вядомых айчынных навукоўцаў і практыкаў у галіне права, прадстаўнікоў дзяржаўных органаў.

## НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

**08 сакавіка Ламека Наталля Уладзіміраўна,** дацэнт кафедры замежнай літаратуры

**09 сакавіка Кухарэнка Варвара Мікалаеўна,** дацэнт кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян

**09 сакавіка Леановіч Алена Барысаўна,** дацэнт кафедры міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права

**12 сакавіка Булатаў Уладзімір Іванавіч,** дацэнт кафедры вышэйшай матэматыкі

**13 сакавіка Сайганава Вераніка Святаславаўна,** загадчык кафедры філасофіі культуры

**18 сакавіка Ільіна Алена Міхайлаўна,** дацэнт кафедры паліталогіі

**19 сакавіка Далгова Ганна Алегаўна,** дацэнт кафедры камп'ютарнай лінгвістыкі і лінгвадыдактыкі

**21 сакавіка Кавальчук-Рабчынская Таццяна Вячаславаўна,** дацэнт кафедры электрахіміі

**22 сакавіка Іванішка Ія Аляксандраўна,** дацэнт кафедры функцыянальнага аналізу і аналітычнай эканомікі

**27 сакавіка Паваляева Наталля Сяргееўна,** дацэнт кафедры замежнай літаратуры

**28 сакавіка Налівайка Іна Міхайлаўна,** дацэнт кафедры філасофіі культуры

**29 сакавіка Храбтовіч Аляксандр Іванавіч,** начальнік штаба грамадзянскай абароны

**31 сакавіка Чмыга Аксана Васільеўна,** дацэнт кафедры канстытуцыйнага права

## АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС**
**НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: раманскіх моў; міжнародных адносін; прыкладной лінгвістыкі; генетыкі; тэорыі функцый; функцыянальнага аналізу і аналітычнай эканомікі; шматпрацэсарных сістэм і сетак.

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: прыкладной лінгвістыкі; тэорыі функцый; матэматычнай кібернетыкі; тэарэтычнай і прыкладной механікі; фізічнай электронікі і нанатэхналогій; неарганічнай хіміі.

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: мытнай справы; гісторыі новага і найноўшага часу; гісторыі беларускай літаратуры; гісторыі Расіі; міжнародных адносін; прыкладной лінгвістыкі; англійскага мовазнаўства; медыялогіі; культуралогіі; сацыяльнай камунікацыі; філасофіі і метадалогіі навукі; фізічнага выхавання і спорту; высокамалекулярных злучэнняў; банкаўскай эканомікі; інаватыкі і прадпрымальніцкай дзейнасці; карпаратыўных фінансаў; міжнароднага менеджменту; паліталогіі; біяхіміі; мікрабіялогіі; тэорыі функцый.

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: мовазнаўства і краіназнаўства Усходу; міжнародных эканамічных адносін; англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў; тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай; тэарэтычнага і славянскага літаратуразнаўства; беларускага мовазнаўства; германскіх моў; прыкладной лінгвістыкі; міжнароднага права; раманскага мовазнаўства; англійскага мовазнаўства; кітайскай філалогіі; англійскай мовы гуманітарных факультэтаў; англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў; сацыяльнай камунікацыі; энергафізікі; эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі; фізічнага выхавання і спорту; арганічнай хіміі; лічбавай эканомікі; інаватыкі і прадпрымальніцкай дзейнасці; міжнароднай палітычнай эканоміі; крымінальнаго працэсу і пракурорскага нагляду; рускай літаратуры; генетыкі; клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін; аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі.

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў; міжнародных эканамічных адносін; фізічнага выхавання і спорту; канстытуцыйнага права; тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: арганічнай хіміі; заалогіі; біяхіміі.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне па рабоце з персаналам, тэл. 209-54-36*

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Да 100-годдзя БДУ стартаваў марафон відэавіншаванняў** – БелТА (25.02), «Мінск-навіны» (26.02).

**Першы ў Беларусі і Кітаі «Кітайска-беларускі слоўнік. Беларуска-кітайскі слоўнік» выйшаў у БДУ** – АНТ (26.02), БелТА, «Інтэрфакс», zviazda.by (02.03), «Звязда» (03.03).

**Прадстаўленне выданняў, прысвечаных 100-годдзю БДУ, на Мінскай кніжнай выставе-кірмашы** – БелТА, «Мінск-навіны», yandex.by, belnaviny.by (16.02).

**Старт рэспубліканскага фотаконкурсу для школьнікаў у БДУ** – БелТА, mir.pravo.by, mazyr.by, narovlya.by (16.02), zviazda.by (17.02), «Настаўніцкая газета», «Звязда» (18.02).

**Адкрыццё студэнцкага аналітычнага клуба ў БДУ** – БелТА (24.02), «Мінск-навіны», mail.ru (25.02), zviazda.by (02.03), Беларусь-1 (09.03).

**Рэспубліканскі конкурс юных карэспандэнтаў у БДУ** – БелТА, bobrlife.by (03.03), zviazda.by, lidanews.by (04.03).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
23 сакавіка 2021 года, № 5 (2242)



*Заняткі на фізічным факультэце ў 1933 г.*




# 10 дзесяцігоддзяў БДУ

## 1930-я: час выпрабаванняў, страт і новых перспектыў

**Дадзены артыкул з'яўляецца працягам распачатага ў папярэднім нумары газеты вялікага нарыса пра гісторыю Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і прысвячаецца бадай самаму супярэчліваму перыяду дзейнасці альма-матар.**

Другое дзесяцігоддзе ў жыцці маладога ўніверсітэта было напоўнена шматлікімі выпрабаваннямі, якія значна запавольвалі і карэкціравалі яго развіццё. Шмат у чым гэтыя тэндэнцыі паступова сталі праяўляцца з канца 1920-х гг. Менавіта тады вышэйшыя навучальныя ўстановы былі ўключаны ў сістэму жорсткага цэнтралізаванага кіравання і планавання, падобную да той, што існавала ў народнай гаспадарцы. Да 1929 г. у ВНУ зніклі рэшткі і без таго абмежаваных акадэмічных свабод (выбары рэктараў, дэканаў).

### Змена парадыгмы: «З савецкай грамадзкасьцю сувязі няма»

Адметнай рысай 1930-х гг. сталі рэгулярныя чысткі шэрагаў выкладчыкаў і студэнтаў, якія аб'ектыўна не садзейнічалі павышэнню «якасці» выпускнікоў. «Пралетарызацыя» сацыяльнага складу студэнтаў дапаўнялася ўсталяванымі Наркамасветы «нормамі» як адлічэння, так і прыёму ў БДУ ў залежнасці ад паходжання. Так, да канца 1929/30 навучальнага года сацыяльны склад студэнтаў БДУ павінен быў выглядаць наступным чынам: рабочыя – 50 %, батракі – 10 %, беднякі – 13 %, серадднякі – 10 %, служачыя – 17 %. Акрамя абнаўлення студэнцтва паводле сацыяльнага становішча, адбываліся змены іх светапогляду.

Пралетарызацыя тычылася і выкладчыкаў БДУ, калі было пастаўлена пытанне пра неабходнасць замены старой буржуазнай прафесуры на савецкую. У такіх абставінах прадстаўнікоў прафесарска-выкладчыцкага складу, якіх так старанна падбіраў у свой час рэктар *У. І. Пічэта*, звальнялі з працы або вымушалі з'ехаць за межы рэспублікі. Толькі ў 1928/29 навучальным годзе былі звольнены 32 выкладчыкі, з якіх 7 прафесараў. Адным з першых з БДУ сышоў прафесар кафедры біялогіі і заалогіі беспазванковых *Аляксандр Сяргеевіч Шчапоццеў* за «проявление российского великодержавного шовинизма». Падставай для звальнення, згодна з заявай у Праўленне БДУ, стаў яго пратэст супраць беларусізацыі кафедры, якую ён узначальваў і «незнакомство с белорусским языком и невозможность читать лекции на иностранном для меня языке». Нават пасля «аслабанення» ў 1929 г. прозвішча Шчапоццева даволі часта сустракалася ў перыядычным друку, на старонках выкрывальніцкіх артыкулаў, дзе яго працягвалі распякаць як лютага ворага на шляху «марксызацыі факультэта», склікалі сходы навуковых працаўнікоў, студэнцтва, арганізоўвалі абмеркаванне вакол гэтага пытання.

У 1933 г., не вытрымаўшы ціску, вымушаны быў з'ехаць з Беларусі ў Омск заснавальнік беларускай заалагічнай навуковай школы прафесар *Анатоль Уладзіміравіч Фядзюшын*. У службовай характарыстыцы дэкан біялагічнага факультэта Ф. І. Дзербянцоў адзначаў, што Фядзюшын у гады грамадзянскай вайны не з'яўляўся казначэем, а быў у званні палкоўніка ад'ютантам белага генерала А. В. Калчака. «За час працы ў БДУ лічыцца прадстаўніком рэакцыйнай часткі прафэсуры, як выкладчык зоолёгіі падбіраў сабе «сваіх» людзей. Да 1929 г. ён трымаў на працы прэпаратара – начальніка былога афіцэра Калчакаўскай арміі Аўчыннікава. На сходах выступае рэдка. Сваіх поглядаў (варожых) адчынена ня выказвае...». Такі погляд, з прыжмураннем на Фядзюшына, у канчатковым выніку быў адным з вырашальных фактараў, якія паўплывалі на звальненне з БДУ. Магчымасці захаваць пасаду загадчыка кафедры заалогіі ў Беларускай акадэміі навук таксама не было. У праекце пастановы па выніках абследавання акадэміі ў сувязі з чысткай і праверкай яе апарату ад 4 красавіка 1931 г. адзначалася, што «праца кафедры [заалогіі] была накіравана на зрыў сац. будаўніцтва, на дыскрэдытацыю палітыкі савецкай улады і камуністычнае партыі, на змазваньне дасягненьня сав. будаўніцтва, на ўсхваленьне б. Расіі і капіталістычнага Захаду. Пры нікчэмнай навуковай вартасьці ўсіх прац яны сьвядома выконвалі сацыяльны заказ нацдэмаў. Кіраўніцтва і склад працаўнікоў яўна варожыя, б. калчакаўцы, нацдэмы. Падрыхтоўка кадраў не разгорнута. Няпрыгодныя людзі набіраліся праз пратэкцыю. Самакрытыка зажата. З савецкай грамадзкасьцю сувязі няма»...

### Махавік рэпрэсій: барацьба з «нацдэмаўшчынай»

Вялікі ўдар БДУ нанесла разгорнутая ў канцы 1920-х і ў 1930-я гг. барацьба з так званай «нацдэмаўшчынай». Праца над пяцітомнай кнігай «Интеллектуальная элита Беларуси» прадэманстравала, што для многіх вядомых навукоўцаў і выкладчыкаў БДУ іх жыццяпіс упіраўся ў расстрэльную сцяну 1937 і 1938 гг. Так, многія навукоўцы і студэнты БДУ былі абвешчаны «ворагамі партыі і народа» і рэпрэсіраваны: акадэмікі *П. Я. Панкевіч і Ц. Л. Бурстын, прафесары У. К. Дыдырка, Я. К. Успенскі, В. Д. Дружчыц, М. В. Азбукін, М. М. Піятуховіч, І. І. Замоцін, М. М. Дурнаво, І. С. Пятосін, А. М. Ляўданскі, Э. В. Змачынскі, І. Я. Герцык* і многія іншыя. За даволі кароткі тэрмін у якасці выканання сацыяльнага заказу дзяржавы і партыі былі падрыхтаваны цэлыя «навуковыя працы», якія тэарэтычна і гістарычна абгрунтоўвалі разгром нацыянал-дэмакратызму. У 1929–1930 гг. на старонках маскоўскай газеты «Комсомольская правда» друкаваліся вялікія артыкулы «карэспандэнтаў з Беларусі», дзе выкрывалася «контррэвалюцыйная дзейнасць беларускіх нацыянал-дэмакратаў», чарнілася праца такіх беларускіх дзеячаў, як *А. А. Смоліч*, *В. У. Ластоўскі*, *А. І. Цвікевіч*, *Я. Ю. Лёсік*, *А. В. Баліцкі*, *С. М. Некрашэвіч*, *У. М. Ігнатоўскі*.

Не абмінуў махавік рэпрэсій і кіраўніцтва БДУ. Былы рэктар *У. І. Пічэта* ў 1930 г. быў арыштаваны па «акадэмічнай справе» і абвінавачаны як «беларускі буржуазны нацыяналіст і вялікадзяржаўны шавініст». 8 жніўня 1931 г. яго выслалі ў Вятку, а затым у верасні 1934 г. перавялі ў Варонеж. Вызвалены ён быў 27 красавіка 1935 г. Наведаць сцены БДУ, які стаў для яго родным, атрымалася толькі ў студзені 1941 г.

У цэлым, з агульнай колькасці рэктараў БДУ за векавую гісторыю амаль палова прыходзіцца менавіта на 1930-я гг. (*Я. П. Каранеўскі*, *І. Ф. Ермакоў*, *А. І. Дзякаў*, *А. С. Кучынскі*, *Н. М. Бладыка*, *А. Н. Андрушчанка*, *У. С. Бабраўніцкі*, *П. П. Савіцкі*), што яскрава сведчыць пра турбулентнасць таго часу, немагчымасць выпрацоўкі доўгатэрміновай стратэгіі развіцця БДУ. Сумна вядомы факт, што ў ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 г. у сутарэннях «амерыканкі» (мінская ўнутраная турма НКУС) былі расстраляны два былыя рэктары (*А. С. Кучынскі, А. І. Дзякаў*). Прыкладаў уздзеяння рэпрэсіўнай машыны ў сценах БДУ ў гэты час хопіць на некалькі соцень старонак самастойнага выдання.

### Разузбуйненне БДУ: стварэнне пяці самастойных інстытутаў

Незаменныя страты панёс не толькі асабісты склад універсітэта, але і яго структурныя падраздзяленні. 23 ліпеня 1930 г. выйшла пастанова ЦВК і СНК СССР «Аб рэарганізацыі вышэйшых навучальных устаноў, тэхнікумаў і рабочых факультэтаў», якая ўзаконьвала рэструктурызацыю факультэтаў універсітэта ў самастойныя ВНУ. Тая непапулярная мера лягла на плечы рэктара БДУ *Я. П. Каранеўскага*. У дакладной запісцы ад 18 сакавіка 1931 г. ён адзначаў, што «БДУ за 10 год свайго існавання развіўся ў магутную, але вельмі складаную, грамадскую па сваёй сутнасці вышэйшую навучальную установу БССР». Пачатак рэарганізацыі быў звязаны са стварэннем у жніўні 1930 г. на базе медфака БДУ асобнага Мінскага медыцынскага інстытута, у новы склад якога перайшла значная колькасць выкладчыкаў і прафесараў БДУ. Сярод іх можна ўзгадаць імя арганізатара кафедры гісталогіі БДУ, комплекснай школы біёлагаў, гістолагаў і цытолагаў Беларусі, першага дырэктара Інстытута біялогіі Акадэміі навук прафесара *Пятра Арыстархавіча Маўрадзіядзі*. Да апошніх дзён жыцця (памёр у 1933 г.) ён прыкладаў усе намаганні для паляпшэння метадычнай і навуковай працы ў Беларусі.

У актыўную фазу рэарганізацыя БДУ ўвайшла ў 1931 г. У маі калегія Наркамасветы пастанавіла стварыць на базе ўніверсітэта пяць самастойных інстытутаў, а 7 ліпеня выйшла пастанова СНК БССР «Аб рэарганізацыі БДУ». У выніку факультэт права і савецкага будаўніцтва ператварыўся ў Мінскі юрыдычны інстытут; факультэт народнай гаспадаркі ў Беларускі інстытут народнай гаспадаркі; хіміка-тэхналагічны факультэт у Мінскі хіміка-тэхналагічны інстытут, які ўвайшоў у склад Беларускага політэхнічнага інстытута. На базе сацыяльна-гістарычнага і літаратурна-лінгвістычнага аддзяленняў педфака быў утвораны Вышэйшы педагагічны інстытут. Пасля разузбуйнення БДУ засталіся толькі тры факультэты: фізіка-матэматычны, хімічны і біялагічны. Гэтай пастановай БДУ быў зведзены, па сутнасці, да ўзроўню спецшколы па падрыхтоўцы кадраў для сярэдніх навучальных устаноў (тэхнікумаў, рабфакаў, ФЗВ), малодшых навуковых работнікаў, малодшых



*А. У. Фядзюшын*



*А. С. Шчапоццеў*



*Студэнты хімічнага факультэта. 1934 г.*

выкладчыкаў ВНУ. У выніку разбуральных мерапрыемстваў прафесарска-выкладчыцкі склад значна скараціўся. У 1931 г. працавалі 13 прафесараў, 24 дацэнты і 23 асістэнты.

Час рэарганізацыі супаў з доўгачаканым заканчэннем будаўніцтва ўніверсітэцкага гарадка БДУ. Але ў новых рэаліях часу ён адразу ператвараўся ў гарадок амаль усёй беларускай вышэйшай школы. Таму праблем з размяшчэннем трох факультэтаў БДУ, якія засталіся ў яго складзе, не паменшала, а, наадварот, пабольшала. Універсітэцкі гарадок быў расцягнуты паміж БДУ, медінстытутам, педінстытутам, наргасам.

## Узнаўленне: «вылучыць БДУ тону паперы на выданне навуковых прац»

Аднак паступова ўніверсітэт стаў адраджацца, зноў набываючы класічныя абрысы сваёй структуры. У 1934 г. пастановамі СНК СССР і ЦК УсеКП(б) «Аб выкладанні грамадзянскай гісторыі ў школах СССР» і «Аб выкладанні геаграфіі ў пачатковай і сярэдняй школе СССР» былі адкрыты гістарычны і геолага-глебава-геаграфічны факультэты. З 1939 г. пачаў дзейнічаць філалагічны факультэт у складзе двух аддзяленняў – рускай мовы і літаратуры, беларускай мовы і літаратуры. У гэтым жа годзе быў закрыты рабочы факультэт, бо ён выканаў сваю задачу. За час яго існавання да паступлення ў ВНУ было падрыхтавана 2000 слухачоў.

Разам з факультэтамі ствараліся і новыя кафедры. У 1932 г. з'явіліся кафедры фізічнай і калоіднай хіміі (заг. прафесар *В. К. Нікіфараў*), глебазнаўства (заг. акадэмік *Я. М. Афанасьеў*), у 1934 г. – кафедра фізічнай геаграфіі (заг. прафесар *І. М. Іваноў*), у 1936 г. – кафедра геаметрыі (заг. акадэмік *Ц. Л. Бурстын*), у 1938 г. – кафедра тэарэтычнай механікі (заг. прафесар *М. А. Сталяроў*). У пастанове СНК БССР «Аб рабоце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта» ад 24 мая 1934 г. акрамя пытанняў арганізацыі факультэтаў 10-м пунктам адзначалася неабходнасць паляпшэння матэрыяльна-бытавых умоў прафесарска-выкладчыцкага складу і, што цікава, «определить Белорусскому государственному университету в третьем квартале тонну бумаги на издание научных трудов».

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ва ўніверсітэце працавалі 6 факультэтаў і 33 кафедры. У склад БДУ ўваходзіў батанічны сад, заалагічны, геалагічны і гісторыка-археалагічны музеі. У 1938 г. колькасць выкладчыкаў павялічылася. Ва ўніверсітэце працавала 16 прафесараў, 57 дацэнтаў і старшых выкладчыкаў, 45 асістэнтаў і выкладчыкаў, сярод якіх 28 – выпускнікі ўніверсітэта. Прэстыж выкладчыка значна ўзрос у сувязі з тым, што некалькі яго прафесараў былі абраны акадэмікамі і членамі-карэспандэнтамі Акадэміі навук БССР (*Ц. М. Годнеў, У. М. Перцаў, М. А. Прыляжаеў, М. П. Томін*).

## Дзяржаўныя экзамены замест абароны дыпломных прац

Значныя змены адбыліся і ў навучальным працэсе. З 1936 г. на падставе пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР былі вызначаны асноўныя формы вучэбнай работы ў ВНУ: лекцыі, семінары, вытворчая практыка, здача дзяржаўных экзаменаў замест абароны дыпломных прац. Значнае месца ў падрыхтоўцы студэнтаў адводзілася мерапрыемствам па ваенізацыі. Напрыклад, у 1935/36 навучальным годзе вывучэнню ваеннай справы ў навучальных планах адводзілася 140 гадзін, а замежнай мовы – толькі 120. У 1935 г. студэнты і супрацоўнікі БДУ правялі першы ваенізаваны велапрабег па маршруце Мінск – Орша – Мінск, а ў 1936 г. каманда рабфака БДУ перамагла ў гарадскіх спаборніцтвах па супрацьхімічнай паветранай абароне. Ва ўніверсітэце актыўна ствараліся абарончыя гурткі. Напярэдадні вайны ў іх было падрыхтавана 800 варашылаўскіх стралкоў, 1539 значкістаў супрацьпаветранай і супрацьхімічнай абароны, 130 матацыклістаў, 170 кіроўцаў, вялікая колькасць парашутыстаў.

За першыя 20 гадоў работы БДУ падрыхтаваў для Беларусі 5240 высокакваліфікаваных спецыялістаў-гісторыкаў, юрыстаў, матэматыкаў, фізікаў і інш. Універсітэт стаў першым этапам творчага ўзлёту многіх вядомых навукоўцаў, такіх як *Т. В. Бірыч, Л. А. Арцымовіч, А. Н. Сеўчанка, М. М. Улашчык* і інш. У БДУ сфарміравалася цэлая плеяда выдатных беларускіх паэтаў і пісьменнікаў – гэта *Кандрат Крапіва, Паўлюк Трус, Алесь Дудар, Тодар Кляшторны, Пятрусь Броўка, Пятро Глебка, Максім Лужанін, Мікола Хведаровіч* і інш.

У 1930-я гады, нягледзячы на неабгрунтаваныя звальненні, рэпрэсіі ў адносінах да шэрагу выкладчыкаў і членаў іх сем'яў, аслабленне ўніверсітэцкай карпаратыўнай этыкі, калектыў БДУ быў захаваны і працягнуў навучальную і навуковую працу.

**Дацэнт Андрэй МАКСІМЧЫК**



*Галоўны корпус БДУ. Студэнты на фізкультурных занятках. 1930-я гг.*



*Студэнцкі гарадок БДУ ў 1920–30-я гг.*

УНІВЕРСІТЭТ
23 сакавіка 2021 года, № 5 (2242)

# «На ўвесь курс быў адзін падручнік філасофіі»

## Выпускнік гістфака 1951 года пра вучобу ў пасляваенны час

«Паважаныя, таварышы! Да вас звяртаецца выпускнік гістарычнага факультэта (выпуск 1951 года) Расціслаў ЦІМАФЕЕНКА. Са СМІ мне стала вядома, што восенню 2021 года будзе адзначацца юбілей універсітэта. Мне б хацелася ад імя выпускнікоў гістфака 1951 года павіншаваць калектыў студэнтаў і выкладчыкаў з гэтай знамянальнай датай…». Такі ліст у БДУ прыйшоў у лістападзе мінулага года. А праз пару месяцаў Расціслаў Раманавіч пабываў у сценах роднага гістарычнага факультэта і падзяліўся ўспамінамі, звязанымі са студэнцкімі гадамі, якія працякалі ў нялёгкі пасляваенны час.





Валейбольная каманда гістфака. 1949 г.



Цімафеенка, Ігнацьеў, Бабушкін ля біякорпуса



Студэнты 1–3 курсаў на канцэрце самадзейнасці ў Фаніпалі. 1948 г.

### Бацька быў гісторыкам: яго гены і ўзялі верх

– Цяпер я жыву ў Гомелі. У гэтым жа горадзе я і нарадзіўся 92 гады таму. Мама была настаўніцай, выкладала хімію і біялогію. А бацька – гісторык, працаваў у чыгуначным тэхнікуме, таксама быў лектарам палітычнага аддзела Беларускай чыгункі. Такое «гістарычнае» імя – Расціслаў я атрымаў з-за таго, што бацька захапляўся гісторыяй. Ён у мяне быў вельмі актыўным. Падчас вайны стаў арганізатарам Гомельскага падполля. Загінуў у 42-м годзе на явачнай кватэры. У гонар яго назвалі вуліцу Цімафеенкі ў нашым горадзе.

Калі пачалася вайна, я скончыў толькі пяць класаў, быў яшчэ зусім зялёным хлопцам. Мама хацела дапамагаць бацьку ў падполлі, але той толькі заявіў: «Не хачу вас бачыць павешанымі на слупах – эвакуіруйцеся».Так мы апынуліся ў Пятроўскім раёне Саратаўскай вобласці, у вёсцы Другая Бяроза. Там мы пражылі тры гады. Мама працавала дырэктарам школы, у якой я вучыўся з 6 да 8 класа.

У Гомель мы вярнуліся толькі 1 жніўня 1944 года пасля вызвалення Гомеля. Школу я заканчваў ужо у родным горадзе. Калі задумваўся пра паступленне, выбар стаяў паміж хіміяй і гісторыяй. Мабыць, бацькавы гены ўзялі верх, таму вырашыў паступаць на гістарычны факультэт БДУ.

### Вучыліся ў трэцюю змену, жылі ў лекцыйных пакоях

Для паступлення трэба было здаць сем іспытаў: рускую і беларускую мовы (вусна і сачыненне), гісторыю, геаграфію і замежную мову. Конкурс быў вельмі вялікі. На нашым курсе з 60 студэнтаў першага курса апынуліся 23 удзельнікі ВАВ, сустракаліся «вялікаўзроставыя» студэнты. Напрыклад, 1916 года нараджэння. Былі і тыя, хто атрымаў інваліднасць падчас вайны. Здзіўляла, што хлопцаў было больш, чым дзяўчат.

У той час рэктарам БДУ быў Іван Савіч Чымбург. Ён жа чытаў нам курс гісторыі Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. А наогул, за час маёй вучобы ў ВНУ, у тым ліку і ў аспірантуры, змяніліся два рэктары. Універсітэтам пасля Чымбурга стаў кіраваць Уладзімір Антонавіч Тамашэвіч, а затым Антон Нікіфаравіч Сеўчанка.

У цэнтры горада, дзе цяпер размяшчаецца галоўны корпус БДУ, знаходзіўся двухпавярховы будынак. Там быў рэктарат, парткам і іншыя грамадскія арганізацыі, а яшчэ ў ім жа займаўся фізмат. Усе астатнія факультэты праводзілі заняткі ў будынках розных сталічных школ. Гісторыкі на першым курсе хадзілі на заняткі ў 17-ю школу ў раёне Кальварыйскіх могілак. Вучыцца даводзілася ў трэцюю змену. Заняткі пачыналіся ў 17 гадзін і доўжыліся ў сярэднім да поўначы.

Асноўны інтэрнат, дзе жылі іншагароднія студэнты, размяшчаўся побач з хімічным факультэтам на Ленінградскай вуліцы. У нашым пакоі жыло 28 чалавек, але гэта яшчэ не самае цеснае суседства. У вялікіх вуглавых пакоях, якія былі ўладкаваны ў лекцыйных аўдыторыях, жылі па 50 чалавек, а ў адной і зусім змяшчалася 80 студэнтаў. «Люксавым» лічыўся пакой у адным з кабінетаў, дзе жыло ўсяго толькі 6 чалавек.

Проста пасярод вялікіх пакояў у інтэрнаце былі ўсталяваны пліты, на якіх круглыя суткі штосьці варылася ці смажылася. Спалі на армейскіх ложках з матрацамі, напоўненымі драўнянай стружкай.

Праведы, па якіх ішла электрычнасць, былі замацаваны слаба, віселі амаль адразу над галовамі. Па іх бегалі пацукі, часам яны падалі на нас, але мы прывыклі да гэтага. Нягледзячы на такія побытавыя складанасці, жыць было весела. Па вечарах у інтэрнаце ладзілі танцы пад балалайку, спявалі песні.

Часы былі цяжкія, галодныя. Усе пяць гадоў мы хадзілі, пастаянна недаядаючы. Звычайна прафкам выдаваў талоны на крупы. Да 47-га года была картачная сістэма, а потым яе адмянілі.

### Стыпенды не хапіла на вясельны касцюм

Стыпендыя на першым курсе была 290 рублёў, на другім – 320 рублёў, на трэцім і чацвёртым – ужо 355 рублёў, а на пятым – 395 рублёў. За інтэрнат даводзілася плаціць у раёне 15 рублёў. Я атрымліваў персанальную стыпендыю імя акадэміка Пічэты ў памеры 500 рублёў. На пражыццё таго хапала, але былі складанасці. Для разумення каштоўнасці грошай тых часоў распавяду такую жыццёвую гісторыю.

Калі я сабраўся жаніцца на пятым курсе, трэба было пашыць касцюм. Адрэз бастону я купляў па 450 рублёў за метр, а мне трэба было аж тры метры. Мая будучая жонка падзарабляла ў той час пянерважатай: прыйшлося ў яе пазычыць грошай на вясельны касцюм.

У цэлым, у нашы студэнцкія часы з адзеннем было туга: хлопцы галоўным чынам насілі старую армейскую форму, якая засталася пасля вайны. Дзяўчаты таксама апраналіся сціпла: перашывалі нейкія рэчы, набытыя на барахолках. Аднойчы ў нашай аднакурсніцы з'явіліся новыя лакіраваныя туфлі: на іх прыходзіў глядзець увесь факультэт.

На другім курсе на заняткі мы хадзілі ўжо ў школу № 4 на Чырвонаармейскай вуліцы, якая знаходзілася побач з Ленінскай бібліятэкай і Домам афіцэраў.

Вучыцца было складана: пасля вайны падручнікаў не было. Але нам пашанцавала з выкладчыкамі, якія давалі шмат цікавай інфармацыі. Усё даводзілася канспектаваць, паглядзець у кнізе штосьці проста не было магчымасці. Як цяпер памятаю: на ўвесь курс быў адзін падручнік па філасофіі – гэта была сапраўдная каштоўнасць.

Нашы старэйшыя прыяцелі-франтавікі вельмі старанна вучыліся. Яны былі нашымі маякамі, да якіх хацелася цягнуцца.

Калі я быў сакратаром камсамольскай арганізацыі на факультэце, мы выпускалі сваю газету. Яна была вельмі яркай, паколькі ў нас быў добры мастак, які маляваў шаржы, карыкатуры. І гэта падабалася студэнтам. Крыху пазней, у 1947 ці 1948 годзе рэгулярна стала друкавацца шматтыражка «За сталінскія кадры». Галоўным чынам там публікавалася інфармацыя пра навучальны працэс, студэнцкае жыццё, звесткі пра спартыўныя спаборніцтвы, навіны ўніверсітэта, рэцэнзіі на пастаноўкі студэнцкага драмгуртка.

Было ў маім студэнцкім жыцці шмат культурных падзей. Калі я быў членам камітэта камсамола, я адказваў за самадзейнасць. Перыядычна ладзілі культпаходы. Як цяпер памятаю, у оперным тэатры было тады 1219 месцаў. Быў знаёмы са шмат якімі акцёрамі Купалаўскага тэатра.

### Вучыўся на гісторыка, а стаў філасофам

Пасля ўніверсітэта ўвесь наш курс раз'ехаўся працаваць галоўным чынам настаўнікамі ў школы. Мяне пакідалі працаваць у Мінску, але ўсё маё жыццё было звязана з Гомелем. Таму я папрасіў вярнуцца ў родны горад. Хацеў пайсці працаваць у школу, але лёс занёс на кафедру філасофіі ў аспірантуры.

Першым маім месцам працы стаў Гомельскі педінстытут, дзе я выкладаў філасофію 17 гадоў, а потым яшчэ 36 гадоў майго жыцця былі звязаны з гэтай жа навукай, толькі ўжо ў Беларускім інстытуце інжынераў чыгуначнага транспарту (цяпер гэта БелДУТ). Тры гады таму я завяршыў практыку выкладання. Апошні час чытаў не толькі філасофію, але і курс Вялікай Айчыннай вайны. Я спецыяльна папрасіў весці гэту дысцыпліну, бо лічыў сваім абавязкам перад бацькам і яго загінулымі таварышамі.

Вельмі любіў сваю працу і студэнтаў. Са сваім першым выпускам 1956 года дагэтуль падтрымліваю сувязь: рэгулярна перапісваемся, стэлефаноўваемся. Самыя светлыя і цёплыя ўспаміны захоўваю і пра БДУ. Заўсёды рады сустрэчы з аднакурснікамі, некаторых атрымліваецца наведваць. Рады пабываць і ў сценах роднай ВНУ, асабліва ў юбілейны год. Няхай квітнее доўгія гады, становіцца альма-матар для вытдатных спецыялістаў сваёй справы і проста добрых людзей!

**Марыя ШНА**

# Інтэлектуалы віруюць

**Нядаўна прайшоў першы адборачны тур у чэмпіянаце «БДУ–100», прысвечаны юбілею ўніверсітэта. Арганізатарам выступіў клуб інтэлектуальных гульняў. Распавядзём, як праходзяць трэніроўкі і ці магчыма патрапіць на чэмпіянат звычайнаму студэнту.**

Клуб быў заснаваны ў 1997 годзе ***Віктарам*** і ***Сцяпанам Цемушавымі***. На той момант яны былі выпускнікамі гістарычнага факультэта. У 2007–2015 гадах клуб узначальваў ***Павел Свярдлоў***. У 2012 годзе да яго далучыўся ***Дзмітрый Штукацер***. Пры ім у 2017 годзе БДУ прыняў фінал адкрытага чэмпіянату ВНУ Расіі, а з 2018 года стаў пастаянная пляцоўкай для чэмпіянату Еўропы сярод студэнцкіх каманд. Штогод праводзіцца цэлая серыя інтэлектуальных спаборніцтваў: студэнцкі чэмпіянат Мінска і моладзевы чэмпіянат БДУ, фэст «Студэнцкія гульні БДУ», школьны фэст інтэлектуальных гульняў «ТрЭК». У наш час клуб інтэлектуальных гульняў БДУ – гэта цэлая каманда прафесіяналаў, трэнерамі працуюць шматразовыя прызёры чэмпіянатаў Беларусі ***Уладзімір Асіпчук*** і ***Ксенія Вараб'ёва***.



Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

*Першы адборачны тур чэмпіянату «БДУ–100», каманда «Токсікі» (ФЖ+ФСК)*

## Традыцыя перамагаць

Сезон пачынаецца ўвосень і доўжыцца з верасня па май. Большасць мерапрыемстваў з'яўляюцца адкрытымі, у тым ліку і для навучэнцаў іншых ВНУ. Студэнцкі чэмпіянат Мінска складаецца з васьмі тураў. Чатыры гульні прымае БДУ, чатыры – БДУІР. Асаблівасць моладзевага чэмпіянату ў тым, што ў ім ёсць абмежаванне па ўзросце. Ён прызначаны для студэнтаў 1–2 курсаў і школьнікаў (гэта значыць для гульцоў-пачаткоўцаў, якім спецыяльна распрацаваны прасцейшыя пытанні). Для дасведчаных гульцоў ёсць шмат іншых гульняў, але заўсёды трэба з чагосьці пачынаць.

Фэст «Студэнцкія гульні БДУ» прайшоў ужо ў сёмы раз. Ёсць цікавая традыцыя, звязаная з дадзеным мерапрыемствам. Так атрымліваецца, што каманда, якая перамагае на фэсце ў БДУ, потым выйграе кубак «Што? Дзе? Калі?» усёй Беларусі. Пакуль што была толькі адна асечка, калі ў 2020 годзе выйгралі ўдзельнікі з Украіны, але спадзяёмся, што сёлета «традыцыя» адновіцца.

## Як праходзяць трэніроўкі?

Трэніроўкі ладзяцца ўвесь час, нягледзячы на тое, ідзе падрыхтоўка да чэмпіянату ці не. Праходзяць яны некалькі разоў на тыдзень, мінімум два. На іх можа прыйсці любы ахвотнік. Трэніроўка адрозніваецца ад гульні тым, што пытанні гуляюцца з разборам. Яны бываюць тэматычнымі: напрыклад, спецыялізацыя на кнопкавых гульнях («Свая гульня» ці «Брэйн-рынг») ці разбор пытанняў пэўнага рэдактара (аўтара пытанняў), у якога свая логіка, свая асаблівасць напісання. Усе вышэйпералічаныя дзеянні павышаюць верагоднасць правільнага адказу.

## Як патрапіць на чэмпіянат?

Калі ёсць каманда – адразу прыходзіць на турнір. Калі ж вы адзіночка – гэта часова! Трэба ўсяго толькі хадзіць на трэніроўкі. На іх з'яўляюцца аднадумцы, з якіх у выніку і ствараюцца каманды. Такая практыка асабліва папулярная ў пачатку сезона. Тлумачыцца гэта тым, што навучацца прыходзяць дзеці, якія нядаўна скончылі школу ці ліцэй. Усе паступілі ў розныя УВА, і папярэднія склады распаліся.

Падчас фарміравання можа быць усякае: напрыклад, калі палова каманды ёсць, а палову яшчэ трэба дабраць, бываюць і выпадкі, калі старшакурснікі набіраюць малодших гульцоў.

У клуба інтэлектуальных гульняў ёсць розныя сумоўі па пошуку гульцоў у сацыяльных сетках. Там трэба пісаць штосьці накшталт: «Я вось такі і хачу гуляць, вазьміце мяне».

І наадварот: «Я капітан каманды, і нам патрэбны гулец». Увогуле, клуб робіць усё магчымае для абмену кантактамі будучых саюзнікаў.

## Што такое «БДУ–100»?

Чэмпіянат «БДУ–100» – гэта разавае карпаратыўнае мерапрыемства. Спецыяльны турнір, які задумваўся як святочны, прысвечаны стагоддзю ўніверсітэта. Ён з'яўляецца закрытым, у ім могуць удзельнічаць толькі тыя, хто адносіцца да БДУ: студэнты, выкладчыкі, супрацоўнікі. Арганізатары закладваюць асноўную думку: трэба падаць глебу для знаёмства паміж пакаленнямі. Адпаведна, прыярытэт у каманд, у ліку якіх больш супрацоўнікаў і студэнтаў. Улічваючы маштаб мерапрыемства, трэба разумець, што ў фінал патрапяць не ўсе склады, якія падалі заяўкі. Ёсць тры адборачныя туры. Нядаўна прайшла толькі першая зімовая гульня, вядучым якой стаў уладальнік крыштальнай савы, вядучы тэлепраграмы «Што? Дзе? Калі?» ***Алесь Мухін***. Пройдуць яшчэ дзве аналагічныя гульні: вясновая і летняя. Адна каманда можа паўдзельнічаць толькі ў адным адборачным туры. Па выніках кожнага будуць адабраны каманды, якія трапяць у фінал (мінімум 4 склады з адной адборачнай гульні). Некаторыя каманды будуць дабірацца за пэўныя дасягненні. Напрыклад, каманду «Матрыярхат» арганізатары запрасілі на фінальны тур, таму што яны сталі найлепшымі ў першай частцы адборачнай зімовай гульні. Увосень будзе фінал чэмпіянату, бо менавіта ў гэту пару года БДУ спаўняецца 100 гадоў.

## Пра рэкардсменаў



**Дзмітрый ШТУКАЦЕР:**

– Не магу сказаць, якая каманда стала найлепшай за ўсе гады гульняў і турніраў. Гэта немагчыма, бо ўсе яркія, са сваімі асаблівасцямі і дасягненнямі. Мабыць, адзначу дзве каманды – зборную геаграфічнага факультэта «Географ глобус прапіў», якая выйграла першыя чатыры сезоны БДУ (папярэднік моладзевага чэмпіянату, таксама рэгулярны турнір), і каманду «Вельмі змянілася за лета», якая некалькі гадоў запар была найлепшай не толькі ў Беларусі, але і годна выступала на еўрапейскім узроўні. Калі гаварыць пра канкрэтных гульцоў, то згадаю ***Васіля Бабкова***, ён цяпер з'яўляецца намеснікам дырэктара РГА «БЛІК» (гэта такі аналаг спартыўнай федэрацыі) па дарослым спорце і галоўным арганізатарам усіх інтэлектуальных гульняў у Мінску. ***Уладзіслаў Порыцкі*** таксама мае шмат дасягненняў, і не толькі ў рамках Беларусі, але і на чэмпіянаце Еўропы (мае 12 медалёў). ***Аляксандр Марозаў*** стаў рэкардсменам па колькасці залатых медалёў за ўсе гады правядзення студэнцкага чэмпіянату. У яго 22 медалі. Трэнерам Аляксандра быў ***Іван Тапчый***, клуб якога выступае аналагам клуба інтэлектуальных гульняў, але толькі ў ліцэі БДУ.

## Пра турнір «БДУ–100»



**Алесь МУХІН:**

– Адзначу вельмі добрую і якасную арганізацыю мерапрыемства. Мне спадабалася тое, як каманды ўліліся ў гульню. Нечаканымі былі і вынікі: адны склады добра сябе праявілі ў пачатку турніру, іншыя, наадварот, бліжэй да канца. «Вішанькай на торце» быў суперфінал па правілах гульні «Брэйн-рынг». Было вельмі шмат нечаканасцяў. Напрыклад, калі лідараў турніру абыходзілі каманды, якія занялі па выніках гульні 6, 7, 8 месцы. Узровень каманд даволі высокі. Усе добра сябе паказалі, хоць мы прывезлі сур'ёзны пакет пытанняў. Іх узровень складанасці быў сустаўны з пытаннямі беларускага тэлеклуба, дзе гуляюць найлепшыя з лепшых на сёння. Рэкамендую камандам максімальна засяроджвацца на трэніроўках. Было відаць, што ў «пачаткоўцаў» першыя пытанні сыходзілі толькі на тое, каб навучыцца чуць адзін аднаго, усё запісваць, правільна фармуляваць адказы.

Галоўныя лайфхакі вельмі простыя: не забываць, пра што канкрэтна пыталася, запісваць асноўныя словы, падзеі, даты, сачыць за нейкімі «цікавосткамі» ў саміх пытаннях. Вельмі часта бывае, што нестандартна ўжытае слова можа намякаць на шлях да пошуку адказу. Вялікая адказнасць падчас гульні ляжыць і на капітане. Ён павінен ведаць, чаго чакаць ад сваіх знаўцаў: хтосьці больш эрудыт, хтосьці – «генератар» версій. Капітан – гэта часам палова каманды. Але ў любым выпадку адзін ён усіх не выцягне, важна, каб гуляў менавіта калектыў.

А камандам я хачу пажадаць верыць у свае сілы, у свае магчымасці, не баяцца разважаць уголас. У вас усё атрымаецца!

## Пра падрыхтоўку да чэмпіянатаў



**Ксенія ВАРАБ'ЁВА:**

– Трэнерам я з'яўляюся ўжо другі год. Бываюць трэніроўкі, калі прысутнічае болей за 25 чалавек. Шчыра прызнацца, у такія моманты я трошкі панікую, таму што складана з імі ўсімі адначасова справіцца, але ў выніку ўсё праходзіць добра. Не сказала б, што ў маёй тактыцы ёсць нейкія асаблівасці. Проста імкнуся падтрымліваць свабодную і расслабленую абстаноўку, каб гэта не выглядала, як «з прымусу». Варта адзначыць, што каманды адразу прыходзяць даволі матываванымі, але падтрымка з майго боку таксама заўсёды ёсць. Калі я бачу, што гульцы «вырастаюць» на маіх вачах, я адчуваю штосьці сярэдняе паміж гонарам і светлай радасцю! Адзін раз мае «падапечныя», якіх я трэніравала, выкінулі маю ж каманду, у якой я гуляла, са студэнцкага чэмпіянату Мінска па «Брэйн-рынгу». Адчуванні былі дзіўныя, але ўсё ж больш у добры бок.

Што я магу параіць пачаткоўцам? Гуляць ва ўсё, што варушыцца, а што не варушыцца – варушыць і гуляць! Форма ў інтэлектуальных гульнях напрацоўваецца амаль заўсёды выключна колькасцю згуляных пытанняў.



**Уладзімір АСІПЧУК:**

– Трэнірую ў БДУ ўжо чацвёрты год. Усё пабудавана вакол дзвюх асноўных гульняў: «Што? Дзе? Калі?» і «Свая гульня». Хітрыкаў шмат, і тэарэтычна завучыць пытанні было б складана, таму важная практыка.

Удзел у абмеркаванні пытання моцна раскрывае чалавека, прымушае яго браць адказнасць, не саромецца таго, што можаш памыліцца.

Праводзіць трэніроўкі мне не цяжка. Па-першае, ходзяць на заняткі па ўласным жаданні, таму нікога не трэба матываваць. Па-другое, на гульнях па-за трэніроўкамі мы можам быць супернікамі, але між намі і студэнтамі існуюць вельмі здаровыя сяброўскія адносіны, і мы разам спрабуем знаходзіць адказы – гэта вельмі яднае. Па-трэцяе, праводзіць трэніроўкі вельмі карысна, бо прапускаеш праз сябе шмат пытанняў і сам вучышся гуляць лепш.

З пытаннямі ўсё проста: існуе вельмі карысны сайт, куды выкладаюцца амаль усе бягучыя турніры. Звычайна я выбіраю некалькі тураў тых рэдактараў, якія хутка сустрэнуцца студэнтам на найбліжэйшых гульнях.

У моманты, калі я бачу, што адзін з маіх вучняў развіваецца, не стаіць на месцы, адчуваю, што праводжу трэніроўкі не дарма. І, шчыра кажучы, пачынаю крыху баяцца, бо такія студэнты адразу становяцца тваімі канкурэнтамі ў інтэлектуальных гульнях. Але больш за ўсё для мяне важна не тое, што студэнты вырастаюць, пачынаюць перамагаць і браць медалі, а тое, што яны пры гэтым развіваюцца як асобы. Бо «ЩДК» – гэта не проста гульня дзеля гульні, гэта яшчэ і вельмі добрая школа: і міжасобасных стасункаў, і ўласнага развіцця.

**Аляксандра ПЕРАВОЗНІКАВА**

УНІВЕРСІТЭТ
23 сакавіка 2021 года, № 5 (2242)

# Сабраць «Скрынку дабра», запісацца ў «Моўны клуб»

## Якія новыя моладзевыя праекты дапамогуць палепшыць студэнцкае жыццё ў 2021?

Ва ўмовах пандэміі ў БДУ значна скарацілася колькасць студэнцкіх мерапрыемстваў, некаторыя з іх былі адаптаваны пад анлайн-фармат. Але студэнцкі актыў не расслабляецца: у конкурсе «Найлепшы моладзевы праект БДУ – 2021» удзельнічаюць 33 праекты рознай скіраванасці – адукацыйнай, забаўляльнай, дабрачыннай. Карэспандэнт газеты «Універсітэт» пагутарыла з кіраўнікамі некаторых ініцыятыў, каб даведацца, як яны будуць развівацца.



*У моўных клубах ад студсаюза студэнты размаўляюць на 6 мовах*





*«Скрынкі дабра» ад валанцёраў БДУ для дзіцячага дома № 7 у Мінску*

**Праект «Моўныя клубы Opportunities from Student Union»**
**Кіраўнік – студэнтка 4 курса хімічнага факультэта Ганна ПАРАМОНАВА:**

– Стварыць моўныя клубы Opportunities from Student Union мы вырашылі яшчэ ўлетку, калі працавалі з камандай міжнароднага напрамку Студэнцкага саюза БДУ. Думалі, што ж карыснага мы можам зрабіць для ўніверсітэта. Тады прыйшло ўсведамленне, што клубы – гэта тая самая залатая сярэдзіна, нескладаная ў рэалізацыі, але вельмі карысная. Яны дазволяць любому студэнту, выкладчыку ці іншаму супрацоўніку БДУ вывучыць новую мову ці падняць свой узровень.

Пакуль плануем вывучаць 6 моў: англійскую, японскую, карэйскую, арабскую, беларускую і французскую, але гэта не ўсё! Бясплатныя заняткі не будуць падобныя да школьных, дзе трэба ўвесь час завучваць матэрыял. Урокі будуць займальнымі: з фільмамі, праслухоўваннем музыкі і, вядома ж, з пастаяннымі зносінамі на замежнай мове. Упэўненыя, што ўсім нам бракуе аднаго – моўнай практыкі.

Цяпер у камандзе, якая працуе над праектам, звыш 20 чалавек. У большасці гэта куратары, якія, як правіла, будуць працаваць удваіх з адной групай. Але каманда яшчэ расце: да нас ужо звярнуліся студэнты, якія «гараць» адкрыццём іспанскага і італьянскага клубаў.

У нас наперадзе каласальная праца на працягу года: адновіцца праца клубаў, якія сабралі ў кастрычніку мінулага года. У маі зробім выпускны для нашых удзельнікаў. У канцы жніўня–верасні плануем новы набор. Паспрабуем здзіўляць незвычайнымі фарматамі заняткаў, прыцягненнем спікераў і замежных студэнтаў, конкурсамі і іншым.

Дапамога ў нашай працы і грант, вылучаны БДУ. Плануем на гэтыя сродкі набыць усё неабходнае для куратараў, зрабіць нататнікі з брэндам для нашых навучэнцаў і рэалізаваць яшчэ некалькі ідэй. Заняткі будуць праходзіць ва ўніверсітэцкіх аўдыторыях.

Я лічу, што кожны моладзевы праект, які можа стрэліць, павінен быць карысным. Калі б вам самому было цікава ў ім удзельнічаць, то гэта поспех. Мы правяралі наш праект у кастрычніку – 554 заяўкі на пяць моў. Лічбы гавораць самі за сябе. Мы не рабілі ніякай рэкламы ва ўніверсітэце, быў толькі адзін пост у групе Студсаюза БДУ.

Студэнтам часта не хапае ўпэўненасці ў сабе, каб рэалізаваць свой праект ці прасунуць на ўніверсітэцкім узроўні нейкую жывую ідэю. Ва ўніверсітэце мноства студэнцкіх арганізацый, якія абавязкова дапамогуць. Для гэтага дастаткова звярнуцца да іх прадстаўнікоў на факультэце. Галоўнае не баяцца.

**Праект TVR**
**Кіраўнік – студэнт 3 курса факультэта журналістыкі Іван РАВЯКА:**

– Наш праект TVR летась прыдумалі цяперашнія чацвёртакурсніцы разам з загадчыцай Алесяй Юр'еўнай для прасоўвання брэнда кафедры і ўмацавання супрацоўніцтва з працадаўцамі. Ініцыятыва дазваляе знайсці ахвотнікаў ствараць аўдыявізуальны кантэнт для беларускага сегмента. Гэта могуць быць тэлепраграмы, радыёперадачы, шоу для Youtube і падкасты. Са свайго досведу сцвярджаю, што ёсць людзі з вогненнымі ідэямі, але яны думаюць, што іх праекты нікому не патрэбныя. А гэта не так. Нам бы хацелася наладзіць супрацоўніцтва крэатараў і замоўцаў.

Пакуль над рэалізацыяй праекта працуе зусім невялікая каманда. Аднадумцаў знайшоў лёгка: спытаў ва ўсіх курсаў, каму цікавая такая ініцыятыва. Ахвотнікі працаваць над ёй знайшліся самі.

Рэалізоўваць праект плануем у два этапы. Першы этап – адбор праектаў. У нашых сацыяльных сетках з'явіцца форма для падачы заявак, патлумачым правілы афармлення прац і пазначым тэрміны. Далей камісія з прафесіяналаў кафедры тэлебачання і радыёвяшчання адбярэ не менш за 10 удалых ідэй па кожнай з двух намінацый (тэлепраекты і праекты для Youtube, асобна – радыёпраграмы і падкасты). Аўтары адабраных заявак атрымаюць запрашэнне на фінал.

Мы арыентуемся на студэнтаў, але да ўдзелу запрашаюцца і абітурыенты творчых спецыяльнасцяў (перш за ўсё журфака, натуральна).

Другі этап нашага праекта – конкурсны дзень, гэта значыць непасрэдная сустрэча з замоўцамі. Фіналісты будуць абараняць свае праекты перад прафесійным журы, якое ўключае прафесіяналаў з беларускіх аўдыявізуальных медыя. Таксама мы арганізуем творчыя сустрэчы з вядомымі журналістамі, вядучымі і блогерамі, яны будуць адкрытыя не толькі для фіналістаў, але і для ўсіх студэнтаў і абітурыентаў, якія цікавяцца стварэннем аўдыявізуальнага кантэнту. У хуткім часе запусцім збор заявак.

Вочны конкурс і творчыя сустрэчы пройдуць на базе факультэта журналістыкі.

Хацелася б, каб наш праект быў карысны для многіх. Бо сакрэт любой паспяховай ініцыятывы ў яе актуальнасці, разуменні мэтавай аўдыторыі і згуртаванасці каманды. Важна разумець, для каго ты працуеш і якія задачы вырашаеш. У Беларусі шмат сфер, дзе бракуе свежых ідэй. Тут любая ініцыятыва можа стрэліць: толькі спрабуй!

**Праект «Скрынкі дабра»**
**Кіраўнік – студэнтка 2 курса гістарычнага факультэта Ганна ЧЫГІР:**

– Часта ў супермаркетах, заакрамах можна заўважыць велізарныя скрынкі, у якія можна скласці цацкі для дзяцей, корм для жывёл ці іншыя прадметы для тых, каму патрэбная дапамога. Аднойчы прыйшла ў галаву ідэя: чаму б не паспрабаваць усталяваць такія скрынкі ў БДУ?

Вырашыла рэалізаваць гэту ідэю, калі стала старшынёй студэнцкага саюза на факультэце. Наша арганізацыя зацікаўлена і ў развіцці дабрачынных мерапрыемстваў. Так нарадзіўся праект, сутнасць якога вельмі простая. На факультэтах будуць усталяваны скрынкі для таго, каб студэнты мелі магчымасць дапамагаць проста ў сценах універсітэта. Пры ўсталяванні скрынкі мы будзем анансаваць, для якога дзіцячага дома, хоспіса ці іншай установы збіраем дапамогу. Для гэтага плануем стварыць спецыяльны telegram-канал, дзе будзем распавядаць пра мэты збору, дзяліцца справаздачамі і анансаваць новыя мерапрыемствы.

Калі скрынкі будуць напаўняцца, будзем адвозіць іх тым, хто мае патрэбу. Плануем арганізоўваць майстар-класы, размаўляць з дзецьмі, хворымі людзьмі – з усімі, каму патрэбная дапамога, прычым выяўленая не толькі ў матэрыяльнай форме. Часцяком увага і зносіны – найлепшы сродак ад усіх перажыванняў і жыццёвых складанасцяў.

Першую скрынку мы сабралі напярэдадні Новага года для дзіцячага дома № 7 у Мінску. Праўда, у гэтай справе дапамаглі пастаянныя спонсары мерапрыемстваў студэнцкага саюза. Гэта быў наш першы досвед. З-за эпідэміі каранавіруса цесна пагутарыць з дзецьмі мы не змаглі, але спадзяёмся, што з паляпшэннем эпідэміялагічнай сітуацыі зможам праводзіць інтэрактыўныя мерапрыемствы на пастаяннай аснове.

БДУ вылучыў грант, які мы выдаткуем на закупку скрынак для праекта. Цяпер над ім працуюць 10 чалавек. Яны будуць адказваць за распаўсюджанне інфармацыі пра праект, адказваць за збор скрынак, узаемадзеянне з дзіцячымі дамамі і іншымі арганізацыямі.

У хуткім часе дзве нашы скрынкі з'явяцца на гістарычным і юрыдычным факультэце. Будзем назіраць, як яны будуць запаўняцца, як студэнты будуць рэагаваць на падобную ініцыятыву. Пасля гэтага ўсталюем скрынкі і на іншых факультэтах.

Хацелася б, каб гэта ідэя знайшла водгук у студэнтаў. Я лічу, што поспех любога моладзевага праекта шмат у чым залежыць ад яго прастаты і даступнасці. Калі нават думаць не трэба, што рабіць, каб паўдзельнічаць. Проста кладзі, ідзі, слухай, а з астатнім дапаможа згуртаваная каманда. Вядома, любы праект павінен вырашаць нейкую праблему і быць карысным грамадству. Наш на гэта і скіраваны.

**Марыя ШНА**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 22.03.2021 г.
Зак. 242. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by